# ВОДГУК

на аўтарэферат кандыдацкай дысертацыі
Мусіенкі Васіля Анатольевіча
“Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў”
(Мінск, 2022. – 29 с.)

Развіццё мовазнаўства апошніх дзесяцігоддзяў характарызуецца перамяшчэннем навуковых інтарэсаў многіх даследчыкаў у сферу аналізу моўных з’яў і катэгорый, звязаных з апісаннем ментальнасці, карціны свету ў кожнай мове. У святле сказанага тэма кандыдацкай дысертацыі В.А. Мусіенкі актуальная і запатрабаваная.

Кандыдацкая дысертацыя Мусіенкі В.А. з’яўляецца першым у беларускім мовазнаўстве навуковым даследаваннем, у якім выяўлены новыя мадэлі семантычнай дэрывацыі, якія заснаваны на суадносінах зыходных нементальных і рэцыпіентных ментальных лексіка-семантычных варыянтаў і характарызуюцца спецыфікай рэпрэзентацыі ў межах субстантыўнага, ад‘‘ектыўнага і дзеяслоўнага кантынуумаў; устаноўлены тыпы міжмоўных карэляцый, тыпалагічнае падабенства і нацыянальна-культурныя адрозненні беларускіх і англійскіх ментальных лексічных адзінак (адносіны семантычнага супадзення, частковай эквівалентнасці і безэквівалентнасці). Устаноўлены асноўныя заканамернасці і напрамкі сэнсавага развіцця іменных і дзеяслоўных лексічных адзінак, а таксама спецыфіка сінтаксічнай спалучальнасці дзеясловаў з субстантывам думка.

Практычная значнасць даследавання не выклікае сумнення: упершыню падрыхтаваны «Беларуска-англійскі тлумачальны слоўнік другасных ментальных намінацый», які стане важным набыткам у беларускай лексікаграфічнай практыцы. Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца ў адукацыйным працэсе пры выкладанні беларускай і англійскай моў, агульнага мовазнаўства, тэорыі і практыкі перакладу, напісанні дыпломных, магістарскіх работ і кваліфікацыйных даследаванняў.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, вынесеныя на абарону, сведчаць пра іх абгрунтаванасць і навізну ў айчынным мовазнаўстве. Даследчык прыклаў значныя намаганні як у галіне збору матэрыялу, так і ў яго дыферэнцыяцыі і навуковай інтэрпрэтацыі. Праца мае прадуманую структуру і ўяўляе сабой цалкам самастойнае навуковае даследаванне ў плане класіфікацыі, аналізу і абагульнення моўных фактаў. Сфармуляваныя вывады з’яўляюцца дастаткова абгрунтаванымі і верагоднымі. Вынікі дысертацыі могуць знайсці выкарыстанне пры далейшай распрацоўцы праблем лінгвістычнай тыпалогіі, семантыкі, а таксама ў лексікаграфічнай і перакладчыцкай практыцы (пры

сістэматызацыі слоўнікавых дэфініцый у тлумачальных і двухмоўных слоўніках, складанні тэматычных, ідэаграфічных і перакладных слоўнікаў).

Усё сказанае вышэй дае падставы сцвярджаць, што аўтар дысертацыі Мусіенка Васіль Анатольевіч заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства.

Кандыдат філалагічных навук
дацэнт кафедры мовазнаўства
Віцебскага дзяржаўнага
ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Півавар Кацярына Сяргееўна

29.09.2022

Подпись удостоверяю
Начальник отдела
Е.П. Соловьева